## VIII Майскія Віткаўскія чытанні
## “Народжаны пад знакам паэзіі”

Яны прахадзілі з 12 па 18 мая 2015 года. Назва для Чытанняў выбрана не выпадкова. Некалі літаратурны крытык Вера Палтаран сказала пра Васіля Вітку: «Ён нарадзіўся пад знакам паэзіі». Сапраўды, паэзія – яго самае першае і самае моцнае творчае захапленне.




*Бібліятэкар Ю. Пархоменка – часты госць у дзіцячых садках горада*

Чытанні адкрыліся акцыяй “Дзень з Васілём Віткам”, якая ўвабрала ў сябе цэлы шэраг мерапрыемстваў і падзей. Для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў ладзіліся экскурсіі па бібліятэцы з Васем Вясёлкіным, лялечныя спектаклі “Праз тэатр лялек – у свет кнігі”, літаратурныя калейдаскопы “Краіна Васіля Віткі”. Кіраўнік праекта “Дашкалёнак-кнігалюб” Вера Рамановіч прачытала выхаванцам дзіцячых садкоў вершы і казкі земляка. У бібліятэцы для падлеткаў прайшла навукова-практычная канферэнцыя “Віткаўскае слова бясконцае, як само жыццё”. Даследчыкі выступілі з працамі па жыцці і творчасці Васіля Віткі, юныя мастакі арганізавалі вернісаж “Вясёлкавая палітра”, дэкламатары ўдзельнічалі ў конкурсе чытальнікаў твораў паэта. Чытачы дзіцячага аддзела спаборнічалі ў напісанні лепшага водгука на твор Васіля Віткі.



*Юныя случчане даўно марылі аб сустрэчы з пісьменнікам У. Ліпскім*

Адзін з этапаў акцыі “Дзень з Васілём Віткам” прайшоў у гарадской дзіцячай бібліятэцы-філіяле №6 імя В. Віткі ДУ “Цэнтралізаваная сістэма

дзіцячых бібліятэк г. Мінска” і насіў назву “Салавей са Случчыны родам”. Тэму чытачы дзіцячага аддзела бібліятэкі, вучні Замосцкай сярэдняй школы, выбралі не выпадкова: у літаратурнай спадчыне случчан юныя шукальнікі знайшлі 14 твораў, дзе гаворка ідзе пра салаўя.

У бібліяграфіі Васіля Віткі – 8 вершаў, у якіх згадваецца пярнаты сімвал Случчыны. Гэтыя вершы рабяты вывучылі і прадэкламавалі на памяць.



*Юныя даследчыкі з в. Замосце годна прадставілі свае працы*

Юныя шукальнікі прадставілі ўвазе сваіх мінскіх сяброў даследчыя працы пад агульнай назвай “Салавей у творчасці беларускіх пісьменнікаў”. Тэарэтычныя выкладкі былі падтрыманы практычным досведам. Дзеці расказалі, дзе можна пачуць салаўя на сваёй маленькаў радзіме - у вёсцы Замосце, далі паслухаць запісаныя на электронны носьбіт салаўіны пошчак ў розныя поры года. У навуковых працах зроблены вывад, што Васіль Вітка, пішучы пра салаўёў, папярэдне вывучаў іх звычкі і паводкі. Дзеці сваімі грунтоўнымі дакладамі зацікавілі прысутных, у ліку якіх быў беларускі пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса “Вясёлка” Уладзімір Ліпскі. Акрамя станоўчых водгукаў, юныя даследчыкі атрымалі запрашэнне наведаць рэдакцыю беларускамоўнага дзіцячага часопіса. Случчане падарылі бібліятэцы імя Васіля Віткі карціну з выявай салаўя, якую намалявала майстар роспісу па дрэве Квасыніцкага цэнтра рамёстваў Наталля



*Загадчык бібліятэкі Т.Патук з падарункам ад слуцкай дэлегацыі*

Белаглазава.

Пабываўшы ў музеі Васіля Віткі, юныя ўдзельнікі Чытанняў атрымалі самыя станоўчыя ўражанні ад сустрэчы з любімым пісьменнікам, часопісам “Вясёлка” і яго складальнікамі. Экскурсанты змаглі пабачыць асабістыя рэчы пісьменніка, падораныя дачкой нашага славутага земляка, рукапісы, кнігі з аўтографамі. Многа цікавага даведаліся школьнікі пра Васіля Вітку – першага рэдактара часопіса «Вясёлка» - з расказаў цяперашняга галоўнага рэдактара выдання Уладзіміра Сцяпанавіча Ліпскага. У падарунак ад “Вясёлкі” чытачам дастаўся цудоўны каляндар “Свята ў хату”, які захоўваецца ў фондзе Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі.



*У музеі можна шмат аб чым даведацца і на што паглядзець*

Добрыя сувязі звязваюць юных чытачоў Случчыны з лаўрэатам прэміі часопіса “Вясёлка” імя Васіля Віткі Анатолем Зэкавым. Беларускі пісьменнік спецыяльна прыехаў на Віткаўскія чытанні. Супрацоўнікі выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”, якія таксама не абышлі ўвагай літаратурны форум, расказалі прысутным аб серыі кніг “Жывая класіка”. Творчая сустрэча “Наміткі ад Віткі” прайшла ў



*Пісьменнік А. Зэкаў рады зноў сустрэцца са слуцкімі чытачамі*




*Супрацоўнік выдавецтва “Адукацыя і выхаванне” дзеліцца планамі і задумамі*

фармаце “пытанне – адказ”. Школьнікі расказалі, што іх хвалюе, пра што яны хацелі б прачытаць у кнігах. Разам з пісьменнікам дзеці чыталі вершы свайго земляка, першага рэдактара часопіса “Вясёлка”, у якім доўгі час працаваў госць бібліятэкі. А выдавецтву пажадалі выдаць зборнік расказаў Васіля Віткі для дзяцей.



*Юныя случчанкі знаёмяцца з экспазіцыяй школьнага музея*

Удзельнікаў пленэра “Сцяжынкамі пісьменніка” віталі ў Акцябрскай базавай школе імя Васіля Віткі. Разам гарадскія і вясковыя школьнікі паўдзельнічалі ў квэсце-паходзе па віткаўскіх мясцінах, наведалі школьны музей, дзе аформлена экспазіцыя “Наш зямляк – Васіль Вітка”.

Чытанні паказалі, што умовай эфектыўнай папулярызацыі беларускай дзіцячай літаратуры з'яўляецца адзіная чытацкая прастора, куды ўключаны і дзеці, якім неабходна дзяліцца ўражаннямі, і дарослыя, гатовыя да новых адкрыццяў.

Дапамогу ў стварэнні такой прасторы можа аказаць школе і сям'і бібліятэка, якая прапануе акрамя традыцыйных формаў (агляд, гутарка, абмеркаванне) такія формы, як ONLAIN-сустрэчы з пісьменнікамі і заняткі па творчаму чытанню.



*Сцяжынкамі Васіля Віткі*

У сваёй працы з чытачамі бібліятэка шырока выкарыстоўвае тэхнічныя сродкі. Цікавасць у маленькіх наведвальнікаў бібліятэкі выклікае электронная выстава “Чараўнік краіны маленства”. Дзеці не толькі даведваюцца пра пісьменніка, але і з задавальненнем чытаць яго вершы і ўрыўкі з казкі

“Вавёрчына гора”. Нямала прыемных хвілін даставілі карыстальнікам Бібліятэчна-адукацыйнага цэнтра “Тэрыторыя IQ” (дзіцячы аддзел) прагляды электронных прэзентацый “Урокі слуцкага Андарсана”, віртуальнага падарожжа “Беларус я, з Беларусі”.